Уладзімір Аляксандраў

выкладчык кафедры філасофіі УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі» (г. Мінск, Беларусь)

# Нацыянальнае і наднацыянальнае ў культуры: сінтэз Д. Андрэева

Паэт і філосаф сярэдзіны XX ст. Д. Андрэеў адзін з першых прадказаў непазбежнасць працэсаў глабалізацыі. Ён жа вылучыў як вынікаючыя з іх праблемы, патэнцыяльныя канфлікты і супярэчнасці, гэтак магчымасці і перспектывы. Глабалізацыя, як вядома, мае шмат вымярэнняў: палітычнае, эканамічнае, навукова-тэхнічнае, культурнае, рэлігійнае, інфармацыйнае і інш. Кожнае з іх, уцягваючы ў інтэграцыйную варонку людзей, рэсурсы, ідэі, утрымлівае як патэнцыял сацыяльных канфліктаў, так і ўмацаванне механізмаў мірнага суіснавання і развіцця дзяржаў і народаў. У рэшце рэшт ад асобных людзей (ад звычайных грамадзян да палітычных і маральных лідараў) залежыць, які бок у гэтых інтэграцыйных працэсах — станоўчы ці адмоўны — пераважыць у канкрэтнай сітуацыі ці сацыяльным працэсе (ад побытавай гутаркі дзвюх асоб з розных культурных асяроддзяў да пагрозы глабальнага ўзброенага сутыкнення).



Д. Андрэеў, воляй лёсу будучы ўцягнуты ў вір найстрашнейшых катаклізмаў XX ст. (удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ахвяра сталінскіх рэпрэсій), востра адчуваў неабходнасць філасофскага, рэлігійнага, мастацкага асэнсавання і адлюстравання трагедый сучаснасці і пошуку надзейных сродкаў ад іх паўтарэння. У сваёй галоўнай працы «Ружа свету» і іншых творах (пераважна — паэтычных) ён сфармуляваў і раскрыў шэраг паняццяў, праз якія тлумачыў як гісторыю чалавецтва, так і сучаснасць. Значная частка гэтых паняццяў — лінгвістычныя новаўтварэнні, што выклікае складанасці з разуменнем і інтэрпрэтацыяй яго твораў. Але калі гэтыя «цяжкасці перакладу» пераадолець, адкрываецца цэласная і па-свойму пераканаўчая карціна сусвету, у тым ліку структуры грамадства і дынамікі яго развіцця. Для апісання і тлумачэння чалавечай гісторыі Д. Андрэеў выкарыстоўвае шчыльна звязаныя паняцці «культура» і «метакультура», «міф» і «трансміф», «народ» і «звышнарод» [1, *51—52*]. Апошняе паняцце не павінна палохаць, бо не мае ні адной агульнай рысы з сацыяльнымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і філасофскімі вучэннямі, ідэалагічнымі і палітычнымі дактрынамі, якія прыстаўку «звыш» выкарыстоўвалі для тэарэтычнага абгрунтавання перавагі адных супольнасцей над іншымі. Творчасць Д. Андрэева, наадварот, прасякнута пафасам катэгарычнага непрымання любой расавай, нацыянальнай, рэлігійнай нецярпімасці, варожасці. Прыстаўкі «мета», «звыш», «транс» для яго азначаюць перш за ўсё неабходнасць уключыць у кола пазнаваемых працэсаў і аб’ектаў не толькі тыя пласты чалавецтва і прыроды, якія існуюць для суб’екта пазнання «тут і цяпер» ці існавалі ў мінулым, але і тыя слаі Зямлі, якія, з’яўляючыся яе неад’емнай часткай, адрозніваюцца ад нашага слою характарам матэрыяльнасці, а таксама колькасцю прасторавых і часавых вымярэнняў. Гэта менавіта тое, што ў міфах і рэлігіях спрадвеку называлася «іншым», «тагасветным», «замагільным» светам. Тое, што да нядаўняга часу безапеляцыйна адмаўляла навука, але ў апошнія дзесяцігоддзі асцярожна стала ўводзіць як паняцці-гіпотэзы «гіперпрастора» [2, *10*], «мультыверсум» ці проста «паралельныя Сусветы».

Метакультурай Д. Андрэеў абазначае ўсю сукупнасць слаёў Зямлі, ахопленую творчасцю і іншай дзейнасцю таго ці іншага звышнарода. Пад звышнародам ён разумее прыкладна тое, што О. Шпенглер абазначаў як «вялікія культуры», А. Тойнбі — «цывілізацыі», Л. Гумялёў — «суперэтнасы», але з некалькімі істотнымі адрозненнямі. Па-першае, паводле Д. Андрэева ў звышнарод уваходзяць усе душы, якія да яго сутнасна належаць, маюць з ім моцную кармічную сувязь і таму працягваюць творчасць у межах ствараемай звышнародам метакультуры ў іншых слаях і пасля сваёй смерці. Для Д. Андрэева памерлых няма — усе жывыя. Яны працягваюць ствараць, працаваць, дапамагаць, ратаваць. Па-другое, калі аўтары канцэпцый лакальных цывілізацый (М. Данілеўскі, О. Шпенглер, А. Тойнбі, С. Хантынгтан) практычна ігнаравалі сотні, тысячы іншых народаў і культур, якія не ўпісваліся ў іх звышмаштабныя — геапалітычныя, геацывілізацыйныя — матрыцы, то для Д. Андрэева няма вялікіх і невялікіх культур. Ён не адмаўляе, што ў гісторыі пэўныя народы адзначаюцца творчымі здабыткамі, буйнейшымі за іншых. Але, па-першае, маштаб і глыбіня творчасці (як асоб, так і супольнасцей) накладае дадатковыя абавязкі перад чалавецтвам, а не надае дадатковых правоў, а па-другое, гэтая «веліч» вымяраецца менавіта культурнымі дасягненнямі (у мастацтве, рэлігіі, філасофіі, навуцы), а не палітычнай ці вайсковай магутнасцю.

Найважнейшымі паняццямі канцэпцыі Д. Андрэева з’яўляюцца таксама «міф» і «трансміф». Міф для яго не ёсць збор памылковых



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уяўленняў старажытных людзей аб паходжанні і ўладкаванні сусвету. Міф ёсць створаная народам цэласная сістэма вобразаў і ідэй, якія знаходзяць сваё ўвасабленне ў палітычных дактрынах і філасофскіх вучэннях, рэлігійных догмах і маральных нормах, мастацкіх творах і побытавых традыцыях, навуковых тэорыях і паўсядзённым укладзе жыцця.

Д. Андрэеў вылучае 4 групы міфаў:

1) міфы вялікіх міжнародных рэлігій (індуізму, будызму, хрысціянства, мусульманства);

2) нацыянальна-рэлігійныя міфы звышнародаў (японцаў, персаў, яўрэяў, галаў, ацтэкаў, інкаў, егіпцян і інш.);

3) агульныя міфы звышнародаў (ад папярэдніх адрозніваюцца тым, што іх ядром стала не пэўная нацыянальная рэлігія, а рэлігія міжнародная ці нерэлігійны агульнакультурны комплекс);

4) агульныя міфы нацыянальныя (напрыклад, паганскія вераванні славянскіх, вугра-фінскіх, балцкіх, цюркскіх і іншых плямён і народнасцей) [1, *52*].

Праз міф ажыццяўляецца ўсведамленне народам іншай, найвышэйшай рэчаіснасці, якая над ім перабывае і часткай якой народ з'яўляецца. Гэтую найвышэйшую рэчаіснасць Д. Андрэеў называе трансміфам. У гэтым сэнсе за міфамі старажытных грэкаў і егіпцян ён бачыць ісціну, колькі б скажэнняў, прымітывізму, выпадковасцей і перадузятасцей яны ні ўтрымлівалі. Гістарычна міф развіваецца і можа ўвасобіцца не толькі і не столькі ў сваіх аднайменных формах (як гэта было ў старажытнасці), але і ў многіх іншых, у першую чаргу рэлігійных і мастацкіх. Галоўнае — не ў формах увасаблення, а ў ступені адэкватнасці — паўнаты, дакладнасці, з якой той ці іншы міфічны аб'ект (літаратурны персанаж ці сюжэт, палітычная ці філасофская ідэя, навуковая тэорыя ці гіпотэза, маральная норма ці рэлігійная догма) адлюстроўвае свой першавобраз, «архе», «прафеномен» (як назваў іх О. Шпенглер) з трансміфа. А гэта складана, бо патрабуе, па-першае, адпаведнай колькасці таленавітых і геніяльных творцаў дадзенай метакультуры, якія здольныя адлюстраваць розныя аспекты трансміфа ў сваіх творах ці дзеяннях і вобразе жыцця, а па-другое, здольнасці шырокіх слаёў носьбітаў дадзенай метакультуры да ўспрымання, асэнсавання гэтых міфаў і ўвасаблення іх у сваім жыцці. Да таго ж трансміф таксама развіваецца, бо дзейнасць творцаў не спыняецца з іх смерцю. Наадварот, яна толькі пашыраецца і паглыбляецца, пераходзячы на новы ўзровень. Як сцвярджае Д. Андрэеў, «для нас сузіранне стварэнняў сінклітаў,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

а тым больш разуменне іх, магчыма толькі ў мінімальнай ступені. Перадача ж іх сэнсу пры дапамозе нашых паняццяў выключана цалкам» [1, *60*].

Асаблівую ролю ў культуры Д. Андрэеў адводзіць так званым «веснікам» — творцам мастацтва, якія праз свае вобразы спрабуюць адлюстраваць менавіта найвышэйшую рэчаіснасць, «іншы свет», яго праўду і прыгажосць, чысціню і веліч [1, *174*]. Менавіта з гэтых пазіцый ён прадстаўляе некалькі дзясяткаў мастацтвазнаўчых «партрэтаў» у «Ружы свету» і паэтычных творах.

Як ужо адзначалася, кожная метакультура ўключае ў сябе шэраг слаёў Зямлі іншай матэрыяльнасці, іншых вымярэнняў. Сярод гэтых слаёў выключную ролю адыгрываюць так званыя «затомісы» — яны ўласна і з'яўляюцца найвышэйшым слоем пэўнай метакультуры, яе «нябесным градам», трансфізічнай вяршыняй, нацыянальна-рэлігійна-культурным «раем». Усяго Д. Андрэеў вылучае 34 такія затомісы (з іх 15 — трагічна недабудаваных, чыё адлюстраванне ў нашым слоі спынілася ці перарвалася з вонкавых ці ўнутраных прычын) [1, *59—68*]. У пераліку затомісаў ёсць тыя, народы якіх альбо зусім зніклі з геаграфічнай і гістарычнай сцэны (Гандвана, Атлантыда), альбо сталі часткай іншых метакультур у наш час (Егіпет, Рым, Вавілон, Персія), і тыя, якія працягваюць самастойна існаваць як культурна-нацыянальна-дзяржаўныя ўтварэнні ў сучаснасці (Кітай, Расія, Індыя, Ізраіль). Асабняком у гэтым спісе адзначана «Арымойя» — затоміс агульначалавечай культуры, які яшчэ толькі пачынае будавацца. Паводле Д. Андрэева адлюстраваннем гэтага з'яўляюцца ўсе тыя працэсы глабалізацыі, якія можна ацаніць станоўчым знакам:



1) пераадоленне застарэлых і недапушчэнне новых канфліктаў на расавай і нацыянальнай глебе;

2) змякчэнне законаў і традыцый, агульная гуманізацыя жыцця, рэформы судовай, пенітэнцыярнай, адукацыйнай і іншых сістэм;

3) утварэнне міждзяржаўных і наддзяржаўных саюзаў (Еўрасаюзу і інш.), якія паступова, але няўхільна будуць весці да неабходнасці стварэння сусветнай федэрацыі;

4) пашырэнне міжкультурнага і міжрэлігійнага дыялогу, які дазволіць зніжаць ці здымаць бар'еры паміж канфесіямі, не адмаўляючы іх непаўторнага аблічча і ўнікальнага ўнёску ў рэлігійнае жыццё;

5) развіццё навукі і тэхнікі такім чынам, каб, з аднаго боку, павышаць узровень дабрабыту, змагацца з беднасцю, хваробамі, непісьменнасцю, а з іншага — з дапамогай навуковых дасягненняў (напрыклад,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адкрыццяў новых крыніц энергіі) вырашаць экалагічныя і іншыя праблемы, выкліканыя самім навукова-тэхнічным прагрэсам.

Д. Андрэеў не быў «ружовым аптымістам» і безадказным утапістам. Многія яго прагнозы, зробленыя ў 40-я—50-я гг. XX ст. адносна самых розных сфер, ужо спраўдзіліся (аб'яднанне ўсёй Еўропы і адкрыццё чыгункі пад Ла-Маншам, распад сацыялістычнага лагера і адкрыццё «цёмнай матэрыі», развіццё экалагічнага руху і знаходжанне вады на Марсе, уздым ісламскага фундаменталізму і падзел пратона). Ён сам бачыў і вялікія пагрозы і небяспекі ў глабалізацыі, галоўная з якіх — пабудова сусветнай дзяржавы як абсалютнай тыраніі. Але паводле яго перакананння шляху назад, у «царства Русо», ужо няма: глабалізацыя непазбежна ў сілу навукова-тэхнічных і сацыяльна-эканамічных працэсаў. Пытанне толькі ў тым, якой яна будзе, па якіх шляхах пойдзе: глабалізацыя — гэта мультыкультуралізм і яго праблемы, міжнародны тэрарызм і змаганне з ім, неверагодны ўздым дабрабыту і адначасова рост беднасці, гуманізацыя жыцця зняволеных і пашырэнне амаральнасці і вычварэнняў, тэхналогіі і вынаходніцтва 5-га ці 6-га пакаленняў і рост непісьменнасці, культурнага здзічэння. Усе гэтыя і іншыя працэсы і тэндэнцыі глабалізацыі пераплецены ў складаны тугі клубок, яны дапаўняюць і ўзаемавыключаюць, спыняюць і паскараюць, знішчаюць і ўзмацняюць адно аднаго. І задача кожнага чалавека ў тым, каб у гэтым клубку пераплеценых праблем і дасягненняў развязаць як мага больш першых і спрыяць як мага болей другім. Творчасць і ўсё жыццё Д. Андрэева менавіта і былі такім прыкладам асабістай працы на «агульначалавечую справу».



*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. *Андреев, Д. Л.* Роза мира. Метафилософия истории / Д. Л. Андреев. — М. : Прометей, 1991. — 288 с.
2. *Каку, М.* Гиперпространство : Научная одиссея через параллельные миры, дыры во времени и десятое измерение / М. Каку. — М. : Альпина нон-фикшн, 2014. — 502 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ